УДК 94(476-89) "14/15"

***Н.А. СКЕП'ЯН***

# УЗАЕМААДНОСІНЫ А.М. ГАШТОЛЬДА З АЛЬБРЭХТАМ ПРУСКІМ

*Адной з функцый канцлераў ВКЛ было ажыццяўленне знешніх зносін з суседнімі дзяржавамі. У канцы XV – першай палове XVI ст. назіраецца актывізацыя канцлераў ВКЛ у заходнім кірунку, што было выклікана імкненнем да правядзення незалежнай ад Кароны Польскай знешняй палітыкі. Найбольшая актыўнасць ва ўзаемаадносінах з Нямецкім ордэнам, а затым і Прускім герцагствам прыпадае на час канцлерства А.М. Гаштольда. Самая вялікая колькасць лістоў да Альбрэхта Брандэнбургскага і яго прыдворных адзначаецца ў перыяд канцлерства А. Гаштольда. Архіўныя матэрыялы паказваюць, што найбольшую цікаўнасць рэспандэнтаў выклікалі пытанні знешняй палітыкі і знешняга гандлю.*

Канцлеры ВКЛ і ваяводы віленскія напачатку XVI ст. сталі актыўна ўдзельнічаць у рэалізацыі знешнепалітычных акцый дзяржавы з Нямецкім ордэнам і Свяшчэннай Рымскай імперыяй. Калі Нямецкі ордэн быў краінай-суседкай і стасункі з ім былі прамымі, то з Рымскай імперыяй прыходзілася абыходзіцца прадстаўніцтвам Кароны Польскай. Адносіны з Нямецкім ордэнам апошнім часам прыцягваюць увагу даследчыкаў. У канцы XV – першай палове XVI ст. назіраецца актывізацыя дыпламатычных і прыватных зносінаў з рыцарамі, а потым і прадстаўнікамі новаўтворанай свецкай дзяржавай. Дыпламатычная актыўнасць паміж дзвюма дзяржавамі знайшла свой адбітак у пісьмовых крыніцах, найбольш шырока гэтыя стасункі прадстаўленны ў ліставанні паміж вышэйшымі ўрадавымі асобамі ВКЛ і Нямецкага ордэна ў дакументах Таемнага дзяржаўнага архіва прускай культурнай спадчыны (Берлін, Германія). Аснову ўтрыманых матэрыялаў складаюць дакументы з цэнтральнага архіва вялікага магістра Нямецкага ордэна, пасля секулярызацыі каторага гэтыя дакументы сталі найкаштоўнейшай і найвялікшай часткай архіва герцага [20, с. 174].

Перш чым непасрэдна звяртацца да перыяду канцлерства Альбрэхта Марцінавіча Гаштольда (1522 – 1539), для больш яскравага параўнання варта звярнуцца да дзейнасці ў гэтым жа накірунку яго папярэдніка на пасадзе канцлера

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Мікалая Мікалаевіча Радзівіла (1510 – 1522). Акрамя таго, што абодва канцлеры прымалі ўдзел, а пасля і арганізоўвалі пасольствы для правядзення межавання паміж Нямецкім ордэнам і ВКЛ [1], адной з іх функцый было вырашэнне спрэчных пытанняў паміж гандлярамі суседніх краін. Для артыкула намі быў абраны перыяд канцлерства А.М. Гаштольда, бо менавіта ў гэты час назіраецца самае актыўнае ліставанне паміж ім і князем Альбрэхтам Гагенцолернам. Для аналізу намі былі ўзяты лісты, што захоўваюцца ў Ордэнскім архіве.

Ліставанне паміж Мікалаем Мікалаевічам Радзівілам і яго паслядоўнікам на пасадзе канцлера Альбрэхта Гаштольда мела трывалы характар, іх карэспандэнцыю можна знайсці не толькі ў архіве лістоў Ордэна, але і ва Усходнепрускіх фаліянтах і архіве лістоў герцага. Калі на перыяд канцлерства М.М. Радзівіла (1510 – 1522) прыпадае толькі 7 лістоў, то астатнія адносяцца да перыяду канцлерства А. Гаштольда. Пік ліставання з М.М. Радзівілам прыпадае на 1520 г., а ў момант пераходу пасады да А. Гаштольда становішча значна мяняецца. Толькі з 1529 па 1538 г. у трох вышэйадзначаных фондах утрымліваецца 64 ліста да А.М. Гаштольда. У 11 з іх узгадваецца яго імя і канцлер выступае там як асоба, здатная вырашаць складаныя пытанні. Пік ліставання з канцлерам ВКЛ прыпадае на 1536 г., калі гаворка вялася пра межаванне паміж ВКЛ і Прусіяй. Імя Альбрэхта Гаштольда неаднаразова ўзгадваецца ў пасланнях ад Мікалая Нібцыя Альбрэхту Прускаму, дзе паведамляецца пра значную ролю Гаштольда ў палітычным жыцці княства і пра аказанне дапамогі для нямецкіх купцоў і дыпламатаў [4, 337 адв.].

Яшчэ на момант існавання Ордэна да А. Гаштольда звяртаюцца падчас вырашэння гандлёвых спрэчак і эканамічных пытанняў, звязаных з нададзеннем ільгот як для нямецкіх, так і для літоўскіх купцоў [11; 12; 13].

Калі ў канцы XV ст. памер ліставання паміж вялікім магістрам і канцлерамі ВКЛ адносна невялікі, то з прыходам Альбрэхта Брандэнбургскага адбываецца актывізацыя падобных кантактаў. Выклікана гэта было памкненнем апошняга пазбавіцца леннай залежнасці ад Польскага каралеўства. Для гэтага яму спатрэбілася наладзіць трывалыя сувязі з магнатамі і арыстакратыяй ВКЛ, каб атрымліваць актуальную інфармацыю пра вялікакняжацкі двор. Як ужо адзначалася вышэй, А. Гаштольд, у адрозненні ад сваіх папярэднікаў, здолеў наладзіць вельмі цесныя сувязі з першым прускім князем – Альбрэхтам Гагенцолернам (1490 – 1568), які быў трэцім сынам маркграфа Фрыдрыха Ансбах-Кульмбахскага і адносіўся да французскай лініі княжацкага дома Гагенцолернаў. Яго маці, Соф'я, была дачкой Казіміра Ягайлавіча і Лізаветы Габсбуржанкі. Такім чынам, апошні магістр быў роднасна звязаны з адным з самых магутных кіруючых дамоў Еўропы: Габсбургаў і Ягелонаў.

Гэта быў шматбакова развіты чалавек. У 16 год па загадзе бацькі паехаў у Італію на вучобу, дзе асаблівую ўвагу надаваў вывучэнню воінскай стратэгіі. Пасля смерці Фрыдрыха Саксонскага стала магчымым яго абранне на пасаду вялікага магістра, што і адбылося 13 лютага 1511 г. Гэтаму абранню спрыяла і яго княжацкае паходжанне, якое давала яму сувязь з імператарскім дваром у Вене, і яго роднасныя сувязі з кіруючым домам Ягелонаў, што магло станоўча адбіцца на сувязях з польскім суседам у пытанні далейшага існавання Ордэна. Пачатак XVI ст. для Ордэна – гэта перыяд барацьбы за самастойнае існаванне. Ён не быў ужо настолькі магутным і ўплывовым, як яшчэ паўстагоддзя таму, бо працяглыя і частыя канфлікты з Каронай Польскай, якая ўвесь час імкнулася падпарадкаваць сабе аслабелы Ордэн, выкарыстоўваючы пры гэтым розныя механізмы ўплыву на вялікіх магістраў, далі плён. Князь Альбрэхт Гагенцолерн-Ансбах працягваў палітыку Фрыдрыха Саксонскага ў адносінах да Польшчы, каб вярнуць

моц Прусіі. Пэўны час гэтаму спрыялі і знешнепалітычныя інтарэсы Габсбургаў. Максіміліян І хацеў пазбавіць дынастыю Ягелонаў хоць якога-небудзь уплыву на палітыку Еўропы, падпарадкаваць сабе род шляхам заключэння шлюбных дагавораў. У 1512 г. Альбрэхт Прускі, карыстаючыся падтрымкай імператара, адмовіўся прысягаць на вернасць Жыгімонту Старому. Нягледзячы на тое што Максіміліян І у 1516 г. падтрымаў патрабаванні тагачаснага магістра па вяртанні зямель Ордэна, якія ім былі страчаны ў 1466 г., рэальнай падтрымкі Ордэн ад імператара не атрымаў. Да гэтага дадаліся рашэнні Венскага кангрэса 1515 г., якія цалкам змянілі геапалітычны малюнак Еўропы. З боку Ягелонаў было паабяцана, што калі сын Уладзіслава Ягелончыка не пакіне спадчыннікаў, то венгерскі і чэшскі троны адыдуць Габсбургам, а таксама ім будзе аказана патрэбная дамапога для барацьбы з туркамі. З другога боку, Максіміліян І прысягнуў, што парывае саюз з Альбрэхтам Гагенцолернам і Васілём III. Дагавор быў замацаваны заручынамі дзяцей Уладзіслава Людавіка і Ганны з унукамі Максіміляна І Марыяй і Фердынандам. Такім чынам, імператар пакінуў вырашэнне ўсіх спрэчных пытанняў з Жыгімонтам Старым вялікаму магістру. Яму засталося толькі выбраць: ці ісці ў плыні палітыкі імператара Свяшчэннай Рымскай імперыі, ці без падтрымкі імператара спрабаваць пазбавіцца васальнай залежнасці ад Польшчы. Для гэтага А. Прускаму неабходны былі трывалыя кантакты з уплывовымі асобамі не толькі ў Кароне Польскай, але і ў ВКЛ. Акрамя гэтага, вялікі магістр спрабуе заключыць дагавор з Васілём III, каб забяспечыць вайсковую дапамогу для барацьбы з Польшчай. У 1519 г. вялікі магістр распачынае ваенныя дзеянні з Польшчай, аднак аслабелы Ордэн быў небаяздольны. Прусія была спустошана польскімі войскамі, і ў 1521 г. ён быў вымушаны заключыць перамір'е.

10 красавіка 1525 г. урачыста на галоўнай плошчы Кракава Альбрэхт Прускі быў вымушаны прынесці ленную прысягу Жыгімонту Старому. Паводле прысягі вялікі магістр павінен быў несці вайсковую службу на карысць Кароны Польскай, больш не меў поўнай юрысдыкцыі і дзяржава з царкоўнай ператваралася ў свецкую. Як свецкі князь, Альбрэхт аб'явіў пра секулярызацыю Тэўтонскага ордэна і ўвядзенне ў Прусіі лютэранства. Пасля секулярызацыі былы вялікі магістр цалкам перабудаваў адміністрацыйную сістэму кіравання, якая радыкальна не адбілася на развіцці дзяржавы. Што ж тычылася знешняй палітыкі, то, як і раней, Прусія працягвала зносіны з балтыйскімі, заходне- і ўсходнееўрапейскімі дзяржавамі. Асобы, якія прадстаўлялі інтарэсы Нямецкага ордэна ў гэтых дзяржавах, не былі адкліканыя і працягвалі, як і раней, працаваць на карысць свайго сюзерэна Альбрэхта Прускага, але ўжо як свецкага князя. Прадстаўніцтвы такога кшталту, як гандлёвыя, так і палітычныя, былі і ў ВКЛ.

Збліжэнне паміж князем Альбрэхтам Гагенцолернам і канцлерам ВКЛ А. Гаштольдам было выклікана, перш за ўсё, цікавасцю да асобы будучага кіраўніка Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага. Альбрэхт Прускі жадаў, каб у выпадку смерці Жыгімонта ён стаў апекуном каралевіча ў Польшчы [18, с. 24]. Такія планы спрыялі А. Гаштольду, які імкнуўся да паўтарэння лёсу свайго дзеда – апекуна каралевіча ў ВКЛ. Абмеркаванне такога праекта з канцлерам магло быць выклікана дастаткова высокім узроўнем даверу да вышэйшага ўрадніка ВКЛ. Магчыма, гэта было звязана і з аднолькавым стаўленнем да палітыкі, якую праводзіла каралева Бона Сфорца [14, с. 80-84]. Каралева, якая імкнулася абмежаваць уплыў магнатаў і падпарадкаваць яго інтарэсам цэнтральнай улады, сутыкалася з моцным супраціўленнем, асабліва ў ВКЛ. Самым магутным праціўнікам аказаўся Альбрэхт Гаштольд.

1529 год стаў таксама годам актыўнага ліставання Гаштольда і з прускім князем Альбрэхтам Брандэнбургскім. У асноўным гэта тычылася спрэчных мо-

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.А. Куляшова

мантаў у размежаванні Інфляндыі [1, с. 175]. Менавіта вырашэнне гэтага пытання стала падставай для ліставання паміж двума Альбрэхтамі. Лісты ад 5.12.1529 [8], 27.12.1529 [10], 7.11.1531 [10] тычацца непасрэдна вырашэння пагранічных пытанняў. З двух бакоў выразна прасочваецца памкненне да вырашэння гэтай праблемы разумным і мірным шляхам. З гэтых лістоў бачна, што ліставанне вядуць асобы, якія з адказнасцю падыходзяць да вырашэння спрэчных момантаў.

У лісце Альбрэхта Прускага ад 2.10.1529 да Альбрэхта Гаштольда князь Прускі паведамляе, што магістр Лівонскага ордэна збірае войскі і Вялікаму княству Літоўскаму трэба больш уважліва аднесціся да гэтага. Не пакідае ён па-за ўвагай і пытанне пра ўнутранае становішча ў княстве, бо ў гэты год зноў абвастрыўся канфлікт сярод паноў-радных. У палітычнага апанента Гаштольда Грыгорыя Осьцікавіча, крайчага літоўскага, разгортваецца барацьба са Станіславам Радзівілам [8, с. 245]. Яе размах выходзіць за межы краіны і пачынае выклікаць цікавасць у гаспадароў іншых краін. Альбрэхт Прускі цікавіцца: "А што канцлер уласна робіць для замірэння варагуючых бакоў?" [7].

У ліставанні канца 30-х гг. XVI ст. выразна прасочваецца непакой пра стан здароўя як Гаштольда, так і Альбрэхта Прускага. Паколькі канцлер з'яўляўся вельмі неардынарнай асобай, то Альбрэхт Прускі быў зацікаўлены ў такім прыхільніку ў суседняй дзяржаве. У гэты час пастаянныя войны з маскоўскай дзяржавай і ўнутраныя канфлікты сярод магнатэрыі сур'ёзна падрываюць здароўе Гаштольда.

Сведчанні пра ролю канцлераў ВКЛ, іх месца ў іерархіі грамадства, ролю канцлерства ў дзяржаўна-палітычным жыцці дапамагаюць раскрыць дакументы, змешчаныя ва Усходнепрускіх фаліянтах [2-6], якія змяшчаюць рознага кшталту інструкцыі. Напрыклад: "...на Літве павінна быць Альбрэхтам Гаштольдам паказана, якім чынам ідзе памежная спрэчка паміж Лівоніяй і Літвой, ён павінен, зыходзячы з сяброўства, даць коней для коад'ютара..." [7, л. 20].

Такім чынам, карэспандэнцыя вялікіх магістраў і іншых правіцеляў не толькі з вялікімі князямі, але і пасадовымі асобамі ВКЛ паказвае імкненне першых атрымаць падтрымку ад найбольш уплывовых людзей княства. З дакументаў вынікае, што ім гэта ўдалося, у выніку чаго яны аказаліся перацягнутымі на бок Ордэна, а потым і Прусіі. Акрамя таго, дадзеныя крыніцы паказваюць мірны характар зносін дзвюх суседніх дзяржаў. Канфлікты, калі яны і былі, насілі лакальны характар і тычыліся спрэчак на памежных тэрыторыях. У 1534 г. Гаштольд зноў накіроўвае пасольства да князя А. Брандэнбургскага, якое было добра падрыхтавана і складалася з асоб, якія добра валодалі лацінскай і нямецкай мовамі. Гаштольд вітае праз паслоў Альбрэхта Прускага і выказвае спадзяванні, што гандаль паміж краінамі будзе весціся таксама ж актыўна, як і раней [11]. Акрамя таго, ён паведамляе князю Прускаму пра пачатак Старадубскай вайны і адносіны з Масквой.

У 1535 г. Альбрэхт Прускі віншуе Гаштольда са шлюбам сына і дзякуе таму за ўпарадкаванне спраў нямецкіх купцоў у Вільні. Магчыма, гэта быў адзін з момантаў, дзякуючы якому Гаштольд змог атрымаць права свабоднага гандлю на тэрыторыі Прусіі для купцоў з Вялікага княства Літоўскага [10]. У сваю чаргу, князь Прускі дае Гаштольду інфармацыю пра міжнародныя падзеі ў Еўропе, больш дакладна, пра падзеі ў Венгрыі, бо гэта непасрэдна ўплывала на ўнутранае становішча княства. Менавіта недарэчнасці са спадчыннасцю венгерскай кароны доўгі час перашкаджалі Жыгімонту Старому прыехаць на тэрыторыю Вялікага княства Літоўскага.

Увогуле, як гэта бачна з лістоў, што датуюцца 1536 г., менавіта Гаштольд з'яўляецца той асобай, што рэгулярна паведамляе Альбрэхту Прускаму пра ўнутраныя справы дзяржавы і ўзаемаадносіны з Масквой [12, 13]. Канешне, боль-

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імені А.А. Куляшова

шую цікавасць для князя Прускага ўяўляюць тыя звесткі, што тычацца непасрэдна ўзаемадачыненняў з Лівонскім ордэнам. Пасольствы, якія туды накіроўваюцца, і тая інфармацыя, што даецца паслам, – вось тое асноўнае, чым цікавіцца князь. Мець такога саюзніка было вельмі карысным для Альбрэхта Прускага. Супрацоўніцтва было ўзаемавыгадным. Альбрэхт Прускі яшчэ не пакінуў спадзяванняў зноў стаць незалежным ад Кароны Польскай, сепаратысцкія настроі Гаштольда таксама былі вельмі моцнымі. Адносіны з ВКЛ у большасці тычыліся гандлю ці культурнай сферы (лісты Альбрэхта Гаштольда і Альбрэхта Прускага наконт Францыска Скарыны). Пытанні вайсковага характару сустракаюцца не так часта і вырашаюцца праз Польшчу.

Як ужо адзначалася вышэй, толькі пры Альбрэхце Гаштольдзе намі адзначана павышэнне актыўнасці ліставання паміж ім і Альбрэхтам Прускім. Па інтэнсіўнасці яго можна параўнаць толькі з ліставаннем Аляксандра Ягелончыка з Фрыдрыхам, калі адбываўся актыўны абмен інфармацыяй пра ўсе знешнепалітычныя падзеі ў краіне і ў памежных дзяржавах.

Унутры новай свецкай дзяржавы не было стабільнасці, і панаванне Альбрэхта Прускага адзначалася хваляваннямі паміж рознымі групамі грамадства. Палітычная і ваенная падтрымка была той апорай, на якой і грунтаваўся уплыў князя, не апошнюю ролю тут адыгрывала і падтрымка канцлера ВКЛ. Смерць Альбрэхта Гаштольда перарвала кантакты вышэйшых ураднікаў двух княстваў. Наступны канцлер вызначаўся вельмі слабай палітычнай пазіцыяй і не змог стаць настолькі моцнай апорай для князя Прускага, якой быў Гаштольд.

На перыяд канцлерства Гаштольда прыпадае больш вялікая колькасць лістоў, што можа сведчыць пра імкненне апошняга да пашырэння сваёй улады праз сувязі з замежнымі уладарамі і павышэнне, дзякуючы такім кантактам, свайго прэстыжу сярод паноў-рады. Падчас канцлерства Гаштольда ім былі наладжаны непасрэдныя сувязі з новаўтворанай свецкай дзяржавай – Прускім княствам. Гэтыя кантакты паўплывалі на пазіцыю А. Гаштольда ў ВКЛ, асабліва ва ўнутраным жыцці.

*ЛІТАРАТУРА*

1. Archiwum Glówny Aktów Dawnych , Archiwum Radziwillów XI. Sygn.4 A-84673 ks. 14
2. Geheimes Staatsarchiv Preußischer Kulturbesitz (StAPK), Hauptabteilung (HA) XX, Ostpreußiche Folianten (OstPrFol) OstPrFol 48
3. GStAPK, HA XX, OstPrFol 49
4. GStAPK, HA XX, OstPrFol 50
5. GStAPK, HA XX, OstPrFol 14298
6. GStAPK, HA XX, OstPrFol 14327
7. GStAPK, HA XX, OstprFol 14337
8. GStAPR, HA XX, Ordensbriefarchiv (OBA) N 20224
9. GStAPR, HA XX, OBA N 20796
10. GStAPR, HA XX, OBA N 21263
11. GStAPR, HA XX, OBA N 23075
12. GStAPR, HA XX, OBA N 23143
13. GStAPR, HA XX, OBA N 23197
14. GStAPR, HA XX, OBA N 24551
15. GStAPR, HA XX, OBA N 23897
16. GStAPR, Ordensfolianten 36
17. GStAPR, OF 49
18. GStAPR, OF 219
19. ***Сагановіч, Г.*** Нямецкі ордэн у беларускай гістарыяграфіі: да праблемы ацэнкі // Дыяспара. Культуралогія. Гісторыя: матэрыялы IV міжнароднага кангрэса беларусістаў "Беларуская культура ў кантэксце культур еўрапейскіх краін", Мінск, 6–9 чэрвеня 2005 г. / пад рэд. А. Мальдзіса, А. Смалянчука. – Мн.: рэд. газ. "Голас Радзімы", 2006. – С. 236-243.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

20. ***Jürgen Sarnowsky:*** Die Quellen zur Geschichte des Deutschen Ordens in Preußen, in: Edition deutschsprachiger Quellen aus dem Ostseeraum (14.-16. Jahrhundert), hrsg. M. Thumser, J. Tandecki, D. Heckmann. – Torun, 2001. – S. 171-99.
21. ***Petrauskas Rimvygas:*** Der Frieden im Zeitalter des Krieges // Annaberger Annalen, Nr 12, 2004. – Mode access: http://annabergerannalen12-2004.pdf. – Date of access 07.09.2006.
22. http://www.gsta.spk-berlin.de – Date of access 07.09.2006.

Паступіў у рэдакцыю 14.02.2007 г.